


# Наш Талачын – наша радзіма

Мінулы год, які быў абвешчаны Годам малой радзімы, стаў магчымасцю для кожнага з нас успомніць пра родны куточак.Мы, бібліятэкары, аддаць доўг сваёй малой радзіме можам актыўнай краязнаўчай працай: ушаноўваннем імёнаў вядомых землякоў; напісаннем гісторый сваіх вёсак, гарадоў, раёнаў; зборам этнаграфічных, фальклорных, тапанімічных матэрыялаў; правядзеннем асветніцкай работы па вывучэнню гісторыі, культуры, прыроды роднага краю.

Летась адзначалася 585-годдзе з часу першагаўпамінання горада Талачын у пісьмовых крыніцах.З гэтай нагоды ў бібліятэцы і па за яе межамі на працягу мінулага года праходзілі цікавыя мерапрыемствы,мэтай якіх стала вывучэнне мінулага і сапраўднага нашага горада і ўсяго краю.Былі арганізаваны кніжныя выставы пад назвамі “Талачын у люстэрку часу” і “Тут радзімы маёй пачатак”. На выставах знайшлі месца кнігі пра горад і край, паэтычныя зборнікі мясцовых паэтаў, буклеты серый “Ведай свой край” і “Славутыя імёны Талачыншчыны”.

Бібліяквэст нагадаў вучням імёны іх знакамітых землякоў, у ліку якіх - Вера Вярба, чые “Ручнікі” пакладзены на музыку і сталі амаль народнай песняй, Пімен Панчанка – аўтар верша “Ода Талачыну”, Леў Сапега – уладальнік мястэчка Талачын, які пабудаваў тут школу, касцёл і шпіталь. Па выніках гэтага інтэлектуальнага спаборніцтва перамагло сяброўства – усе вучні атрымалі прызы.

Тэматычны вечар “Любімы сэрцу горад” і гульня-віктарына "Паклон табе, зямля бацькоў" прадоўжылі шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных

юбілею горада. У імпрэзах удзельнічалі навучэнцы старэйшых класаў школ горада. У ходзе мерапрыемстваў выкарыстоўваўся паказ слайдаў і відэастужка вядучага беларускага тэлебачання  Алега Гарбуза "Гісторыя Беларусі: Стары Талачын і хата Льва Сапегі".

Роднаму гораду прысвяціў свае відэастужкі кіраўнік Талачынскай народнай аматарскай кінастудыі "Летапіс" Дзмітрый Іўчанка. У бібліятэцы ім быў прэзентаваны рэтрафотавернісаж "Талачын. Старонкі гісторыі".

Цягам  ліпеня кожную нядзелю ў чытальнай зале бібліятэкі праходзіла акцыя “Табе, мой горад, прысвячаю...” Усе жадаючыя змаглі прыняць удзел у акцыі ў фармаце гучных чытанняў. Карыстальнікі бібліятэкі мелі таксама магчымасць сустрэцца ў бібліятэцы з мясцовымі паэтамі, членамі літаратурнай гасцёўні “Друць” і пазнаёміцца з іх творамі. Да акцыі бібліятэкарамі былі падрыхтаваны буклет “Вершы малой радзімы” і выстава-інсталяцыя ў форме літаратурнага дрэва “Гонар нашага краю”, на якім можна пабачыць партрэты славутых землякоў: Веры Вярбы, Алеся Петрашкевіча, Алеся Рылько, Івана Батрака, Нічыпара Пашкевіча, Міхася Зарэцкага, Міхаіла Савіцкага, Лявона Баразны, Валерыя Славука і Васіля Галубовіча.

Сёлетанаведвальнікаўбібліятэкі таксама чакае шмат цікавага і спазнавальнага: гульнявыя праграмы, інтэлектуальныя спаборніцтвы, краязнаўчыя падарожжы, сустрэчы са знакамітымі землякамі. Усе яны будуць звязаны з нашым краем, таму што, як піша ў самім вершы “Сповeдзь” Віктар Бірукоў,

*Мой Талачын, мая Радзіма.*
*Мае палеткі і лясы.*
*Мяне тут маці нарадзіла,*
*Сказала: «Усё тваё тут, сын»...*
*Віктар Бірукоў, “Сповeдзь”*

Бібліятэкар I катэгорыі
аддзела абслугоўвання і інфармацыі
Талачынскай ЦБС
Ірына Труханёнак
“Краязнаўчая газета” №9, сакавік 2019года